ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА. БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (1022). ● ЧАЦВЕР, 20 верасня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

СЁННЯ У НУМАРЫ:

● ВЫНІКІ ПРАЦЫ ЗА ГОД ● У АЎДЫТОРЫІ ПРЫХОДЗІЦЬ ТЭХНІКА ● НАСТАЎНІЧАЮЦЬ СТУДЭНТЫ ● ВЕРАСНЁЎСКІЯ ВЫПРАБАВАННІ ● ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. З. ХАРУЖАЙ ● ЗАПРАШАЮЦЬ САМАДЗЕЙНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ

ТАК МЫ ПРАЦАВАЛІ

ВЫНІКІ 1972—1973 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

На мінулым тыдні вучоны савет БДУ разгледзеў вынікі 1972—1973 навучальнага года. Згодна з данымі, прыведзенымі ў дакладзе прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С. А. Умрэйкі, ва універсітэце займалася 17147 студэнтаў: на дзённай форме навучання — 9396, вячэрняй—3106, завочнай — 4645 чалавек.

Вучэбна-педагагічную працу вялі 1136 навукова-педагагічных работнікаў (81 прафесар і доктар навук, 498 дацэнтаў і кандыдатаў навук і 557 чалавек без ступеняў і званняў).

Агульная паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання ў цэлым па універсітэту ў параўнанні з 1971—1972 навучальным годам знізілася на 0,8 працэнта і склала 90,7 працэнта. Менш студэнтаў здалі вясеннюю сесію на выдатна, больш атрымана нездавальняючых адзнак. Вышэй агульнай сярэдняй паспяховасць на

гістарычным — 96,06 працэнта;
філалагічным — 95,8;
юрыдычным — 94,4;
хімічным — 93,8;
журналістыкі — 93,8;
геаграфічным — 92.

Ніжэй сярэдняй на
матэматычным — 90,5;
ФПМ — 89,4;
фізічным — 86,5;
спецфакультэце прыкладной матэматыкі — 83,1;
біялагічным — 78,7.

Выклікае заклапочанасць павелічэнне колькасці двоечнікаў на юрыдычным — з 2,3 працэнта да 5,6, біялагічным — з 12,5 да 21,3, геаграфічным — з 5,6 да 8,0, факультэце журналістыкі—з 4,0 да 6,2, факультэце прыкладной матэматыкі — з 8,6 да 10,6 працэнта.

Калі параўнаць паспяховасць па курсах, то найбольш высокая яна на пятым — 99,3 працэнта, чацвёртым — 96,1. а ніжэй сярэдняй на першым — 85,87, другім — 87,46 і трэцім — 87,83.

Такое ж становішча з паспяховасцю ў студэнтаў вячэрняй формы навучання.

Савет указаў на асноўныя прычыны нездавальняючых вынікаў года: слабую работу дэканатаў і кафедр па ўдасканаленню навучальнага працэсу, недастатковую арганізатарскую дзейнасць па рэалізацыі сацыялістычных абавязацельстваў і сваіх добрых планаў. Адпавінна стаць навуковая арганізацыя вучэбнага працэсу. Першарадная задача тут — распрацоўка аб'ёму і зместу адукацыі па кожнай спецыяльнасці. Неабходна працягваць работу па ўдасканаленню вучэбных планаў і праграм, падбору і зместу спецкурсаў, пастаноўцы лабараторных практыкумаў, не дапускаць самавольнага змянення суадносін лекцыйных гадзін, практычных і лабараторных заняткаў. Увага грамадскіх кафедр павінна быць сканцэнтравана на ўкараненні новых эфектыўных форм і метадаў марксісцка-ленінскай падрыхтоўкі студэнтаў, прыцягненні іх да актыўнай прапагандысцкай работы сярод насельніцтва, для таго, каб студэнты авалодвалі навыкамі агітацыйна-прапагандысцкай і арганізацыйна-палітычнай работы. Трэба палепшыць пастаноўку вывучэння студэнтамі асноў савецкага заканадаўства і прапаганду сярод іх прававых ведаў, забяспечыць больш глыбокае вывучэнне курсаў «Ахова прыроды», «Ахова працы», этыкі і эстэтыкі і іншых дысцыплін, якія ўведзены ў адпаведнасці з указаннямі рэктарата.

Важныя і неадкладныя задачы стаяць па навуковай арганізацыі працы студэнтаў. Савету НАП і навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу сумесна з калектывамі кафедр педагогікі і псіхалогіі і ўсіх кафедр універсітэта належыць ушчыльную заняцца вывучэннем бюджэту часу студэнтаў, вызначыць працаёмкасць вучэбных праграм і заданняў, распрацаваць і ўкараніць навукова абгрунтаваную мадэль рэжыму для студэнтаў.

Асаблівага клопату патрабуе вытворчая практыка студэнтаў. У мінулым навучальным годзе вытворчую практыку праходзілі 1522 студэнты дзённай і 322 студэнты вячэрняй і завочнай форм навучання, вучэбную практыку прайшлі 3393 студэнты. Палепшылася арганізацыя практыкі на фізічным, геаграфічным, юрыдычным і гістарычным факультэтах. На многіх кафедрах перапрацаваны і ўдасканалены праграмы практыкі з улікам сучасных патрабаванняў. Больш цеснымі сталі сувязі з базамі практыкі фізічнага, хімічнага, юрыдычнага факультэтаў, факультэта прыкладной матэматыкі. Палепшылася якасць справаздач па практыцы. Аднак ёсць тут і шмат недахопаў. Дэканаты ФПМ і матэматычнага факультэта, напрыклад, спазніліся з падрыхтоўкай да правядзення практыкі. Кіраўнікі практыкі ад кафедр не садзейнічаюць арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Пры наведванні баз практыкі не робяць запісаў у дзённіках аб выніках праверкі. Асобныя кіраўнікі практык рэдка выязджаюць на базы і не ведаюць, як студэнты выконваюць праграмы і індывідуальныя заданні. Яшчэ не ўсе факультэты праводзяць канферэнцыі па выніках вытворчай і вучэбнай практык.

Рэктарат прапанаваў шэраг канкрэтных захадаў, каб сёлета студэнцкая практыка прайшла на больш высокім узроўні.

На савеце разгледжаны таксама вынікі вучэбна-выхаваўчай работы з замежнымі студэнтамі.

НАВІНЫ

З пачаткам навучальнага года аднавілася традыцыя лектарскіх выездаў на прамысловыя прадпрыемствы. На гэты раз групу выкладчыкаў юрфака дацэнтаў В. А. Дарогіна, К. В. Кічыгіну, М. М. Гапановіча, выкладчыка А. У. Баркова сустракалі аўтазаводцы. У цэхах адбыліся лекцыі «XXIV з'езд КПСС аб савецкай законнасці», «Адказнасць за парушэнні правіл руху», «Крыміналістыка на службе барацьбы са злачыннасцю», «Барацьба з хуліганскімі праявамі ў сацыялістычным грамадстве».

Наступны выезд адбудзецца ў канцы верасня з лекцыямі на маральна-этычныя тэмы.

Л. КЛЯУС.

На факультэтах і ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта пачалася падпіска на газеты і часопісы на 1974 год. Паказчыкі мінулагодняй падпіскі сведчаць аб высокай грамадскай актыўнасці членаў нашага калектыву. Супрацоўнікі БДУ выпісалі розных выданняў на 1500 экземпляраў больш у параўнанні з 1972 годам. На 223 чалавекі ўзрасла колькасць падпісчыкаў «Праўды», на 246 — партыйных выданняў. Агульная сума падпіскі склала 41 тысячу рублёў. Лепш за іншых правялі падпісную кампанію біяфак, гістфак, філфак, ФПМ, навукова-даследчы інстытут. На 1042 выданні больш выпісалі студэнты.

Цяпер актыўна прыступілі да правядзення падпіскі на геафаку, юрфаку, гістфаку, біяфаку, на кафедры нямецкай мовы, у бібліятэцы.

А. РУКШЫН,

Днямі ў калгасы і саўгасы Бярэзінскага і Чэрвеньскага раёнаў, на палях якіх працуюць студэнты БДУ, адправіцца універсітэцкая агітбрыгада. Створана яна на базе юрыдычнага факультэта. Самадзейныя артысты падрыхтавалі цікавую канцэртную праграму.

М. МАЦЕЙКА,

ІНСТЫТУТ АДКРЫТ

Урачыста прайшло адкрыццё інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ. НА ЗДЫМКАХ: у прэзідыуме сакратар ЦК КПБ А. Т. КУЗЬМІН, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ А. Ц. КАРАТКЕВІЧ, начальнік аддзела выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прафесар А. П. ШАПТУЛІН, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. КРАСОЎСКІ, рэктар БДУ прафесар У. М. СІКОРСКІ, дырэктар інстытута дацэнт А. Д. МАЛОЧКА.

Перад слухачамі выступае міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. МЯШКОЎ.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

СЛУХАЧЫ—ВЫКЛАДЧЫКІ

Цяпер у аўдыторыях і калідорах стаіць цішыня: асноўная маса студэнтаў на сельгаспрацах, а старшакурснікі — на практыцы. Але калі ў другой палове дня падняцца на другі паверх геаграфічнага корпуса, то можна акунуцца ў перадлекцыйную мітусню. Адны абмяркоўваюць апошнія падзеі ў Чылі, другія спрачаюцца аб творчасці Салтыкова-Шчадрына, трэція, важна дастаючы канспекты з партфеляў, проста размаўляюць «пра жыццё». Калі б не гэтая важнасць і некалькі незвычайны ўзрост прысутных, то ўсіх іх можна было б проста прыняць за бесклапотных студэнтаў. Але гэта не студэнты, а слухачы факультэта павышэння кваліфікацыі (ФПК) выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На працягу некалькіх год ва універсітэце працуе і ФПК выкладчыкаў вну па прыродазнаўчых навуках, а нядаўна пры універсітэце адкрыўся інстытут павышэння кваліфікацыі (ІПК) выкладчыкаў грамадскіх навук вну. Цяпер БДУ — адзін з буйнейшых у краіне цэнтраў павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў.

Ваш карэспандэнт сустрэўся з дэканам ФПК для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Паўлам Пятровічам Борсукам і папрасіў яго расказаць пра факультэт.

— Наш факультэт існуе сёмы год і выпусціў ужо каля тысячы слухачоў. Цяпер у нас займаецца 70 чалавек з Беларусі, Прыбалтыкі, Малдавіі і Украіны. Слухачы факультэта — выкладчыкі гісторыі, грамадазнаўства, палітычнай эканоміі, навуковага атэізму, рускай мовы і літаратуры, эстэтыкі. У вучэбных планах сярэдніх навучальных устаноў эстэтыка — новы прадмет, і пакуль спецыялістаў-выкладчыкаў не хапае. Мы спрабуем у якойсьці ступені ліквідаваць гэты прабел.

Цяпер займаецца першы паток, а з 1 лютага ў аўдыторыі прыйдуць слухачы другога набору.

За час навучання выкладчыкі праслухаюць цыкл лекцый па асноўных праблемах у сваіх галінах навукі і, гэта асабліва важна, па методыцы выкладання. Гэтыя лекцыі чытаюць нашы вопытныя выкладчыкі, такія, як прафесары С. А. Умрэйка, Г. М. Трухноў, А. А. Лойка, М. Г Булахаў і іншыя. Акрамя лекцый, слухачы па пэўных тэмах напішуць рэфераты, а ў канцы курса здадуць экзамены.

В. БАРМІН.

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

В. З. ХАРУЖАЙ

ЖЫЦЦЁ — ПОДЗВІГ

У БАБРУЙСКІМ краязнаўчым музеі захоўваецца выпіска з метрычнай кнігі за 1903 год. У ёй 14 верасня (па старому стылю, па новаму — 27 верасня) свяшчэннік Міхаіл Сярніцкі і дыякан Міхаіл Занкевіч засведчылі сваімі подпісамі факт нараджэння сто дзевяноста трэцяй па ліку жанчыны за год — Веры Захараўны Харужай. Служыцелі культу не ведалі тады, што яны рэгіструюць будучую цвёрдакаменную камсамолку, бальшавічку, свайго непрымірымага класавага ворага.

Дачка былога памочніка паліцэйскага прыстава першай часткі горада Бабруйска, якога ў 1908 годзе выгналі са службы, прыпомніўшы, як у 1905 годзе ён адмовіўся страляць у дэманстрантаў, расла на рэдкасць кемлівай. Яна, як губка, увабірала ў сябе ўражанні навакольнай рэчаіснасці. Бацька доўга не мог знайсці работу, і сям'я жыла ў пастаяннай нястачы, у голадзе. Не вытрымаўшы галоднага існавання, Харужыя восенню 1909 года пераехалі ў Мазыр. У гэтым маляўнічым палескім гарадку прайшло юнацтва Веры. З вялікай цяжкасцю бацькам удалося уладкаваць Веру вучыцца ў гімназію. Вучылася Вера вельмі добра, па ўсіх прадметах, акрамя малявання і спеваў, яна атрымлівала пяцёркі. У 1919 годзе Вера заканчвае Адзіную працоўную школу другой ступені.

Пасля выгнання нямецкіх акупантаў з тэрыторыі Беларусі Палессе на некаторы час стала савецкім, і Вера ўладкавалася працаваць настаўніцай школы ў вёсцы Пагарэлае Мазырскага павета, адначасова падзарабляючы на падзёншчыне ў кулака ў вёсцы Рагалі. Марыла аб гісторыка - філалагічным факультэце Маскоўскага універсітэта. Перашкодзіла хвароба, а потым новая акупацыя: на маладую савецкую рэспубліку напалі легіёны Пілсудскага. Веры прыйшлося пакінуць выкладчыцкую работу. Іменна ў тыя суровыя гады грамадзянскай вайны жыццёвыя дарогі Веры цесна пераплятаюцца з цяжкімі дарогамі нашага слаўнага Ленінскага камсамола. Да горада рваліся банды балахоўцаў. Вера ўступае ў першы ў сваім жыцці смяротны бой з ворагамі плячом к плячу з юнакамі - камсамольцамі. Разведчыца камуністычнага атрада, яна хадзіла ў штыкавую атаку і ў вызвалены Мазыр уступіла разам з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі. Гэта дало ёй маральнае права стаць паўнапраўным членам Камуністычнага Саюза моладзі. Праз многа год яна пісала з турмы: «Камсамол, камсамол! Не пяць, а пятнаццаць, пяцьдзесят год бяссільны прымусіць мяне забыць аб тым, што камсамол зрабіў мяне бальшавічкай, выхаваў, загартаваў, навучыў не толькі змагацца, але і любіць рэвалюцыйную барацьбу больш за ўсё, больш жыцця».

Адукаваных камсамольцаў у той час было мала, таму Веру ў хуткім часе назначаюць кіраўніком спраў камітэта камсамола, а потым пераводзяць на пасаду бібліятэкара, потым выбіраюць у састаў камітэта камсамола. Пазней яна працуе на пасадзе загадчыцы палітасветаддзела павятовага камітэта камсамола.

Зімой 1921 года Веру пераводзяць на работу ў яе родны горад Бабруйск. Першы час яна працавала інструктарам павятовага камітэта камсамола. Вясёлая, вельмі энергічная, жыццярадасная, яна хутка стала сваёй і сярод бабруйскай моладзі. З зайздроснай нястомнасцю яна імкнулася ўсюды паспець, усюды быць напярэдзе: днём удзельнічае ў суботніку па разгрузцы баржаў з дровамі для горада або па добраўпарадкаванню гарадскога парку; вечарам праводзіць гутарку з моладдзю або заняткі ў гуртку ліквбеза, а ноччу разам з камсамольскім патрулём атрада часцей асобага прызначэння ахоўвае спакой гараджан.

У снежні 1921 года Бабруйская партыйная арганізацыя прымае 19-гадовую дзяўчыну ў свае рады, а камсамол рэкамендуе «самага адукаванага члена бюро павятовага камітэта» на вучобу ў Мінскую саўпартшколу.

Пацягнуліся дні і тыдні сапраўднага далучэння да ведаў. Як і ўсе слухачы, Вера актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці. Мінскі абком камсамола накіроўвае яе ў Дом юнацтва імя Карла Лібкнехта. Тут выхоўваліся сіроты, былыя беспрытульныя дзеці і падлеткі — ахвяры імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, нямецкай і белапольскай акупацый, засухі ў Паволжы. Было іх каля 200 чалавек. Вера — невысокая, худзенькая дзяўчына ў гімнасцёрцы, мала чым адрознівалася ад сваіх падапечных. Прыйшла яна працаваць у Дом юнацтва ў цяжкі, складаны час. Першыя яе гутаркі былі аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна. Адразу ж яна палюбілася рабятам.

Адначасова з вучобай, вялікай грамадскай работай Вера далучаецца да публіцыстычнай дзейнасці. Ужо тады яна змяшчае на старонках «Красной смены» (цяпер «Чырвоная зменз») нарысы «Таварыш Бярлюцкі» і «Апошняя баявая старонка», замалёўкі «Даёш у флот», рэпартаж «У храме гасподнім» і многія іншыя матэрыялы. Беларускія пісьменнікі Андрэй Александровіч і Міхась Чарот звярнулі ўвагу на маладую журналістку, якая пісала яркa, палымяна, з агеньчыкам. Вера стала сваім чалавекам у літаратурным асяроддзі. Хутка новага намесніка загадчыка палітаддзела ЦК камсамола рэспублікі, улічваючы яе здольнасці, накіроўваюць на пасаду рэдактара газеты «Юный пахарь», а таксама выбіраюць членам рэдкалегіі журнала «Полымя рэвалюцыі».

Р. БУЛАЦКІ,
прафесар.

(Працяг будзе).

ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ, ДЗЕНЬ ЗАЎТРАШНІ

У мінулым навучальным годзе дэканаты, кафедры, партыйныя арганізацыі правялі значную работу па навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу і кіравання, а таксама ўкараненню тэхнічных сродкаў і вылічальнай тэхнікі. За гэты час многія кафедры набылі дастатковую колькасць дыяпраекцыйнай апаратуры, 52 навучаючыя і кантралюючыя машыны «КІМ-5». Факультэт журналістыкі мае цяпер відэамагнітафон. На падрыхтоўчым і філалагічным факультэтах абсталяваны лінгафонныя кабінеты. На факультэце журналістыкі створан агульнаўніверсітэцкі радыёвузел. Рэдакцыйная калегія (адказны рэдактар дацэнт М. Е. Дастанка) будзе штотыднёва выпускаць радыёгазету. Дарэчы, кафедра тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання—адна з перадавых ва універсітэце па укараненню тэхнічных сродкаў навучання. Тут створаны радыё- і тэлестудыі, заканчваюцца падрыхтоўчыя работы па ўкараненню ў навучальны працэс відэамагнітафоннага запісу.

Рэктаратам распрацаван і зацверджан план па ўкараненню ў вучэбную і навукова-даследчую работу вылічальнай тэхнікі. У адпаведнасці з гэтым планам у 1973-74 годзе будзе створана вылічальная зала для студэнтаў, дзе можна будзе выконваць курсавыя, дыпломныя работы і неабходныя разлікі к навуковым даследаванням. На першым этапе вылічальная зала будзе абсталявана клавішнымі вылічальнымі машынамі і сродкамі падрыхтоўкі даных для ЭВМ, а на наступных—сродкамі ўводу і выводу даных на ЭВМ.

Для больш хуткага і шырокага ўкаранення вылічальнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў у навучальны працэс і навукова-даследчую работу ў новым навучальным годзе для прафесарска-выкладчыцкага саставу прыродазнаўчых факультэтаў арганізуецца семінар па вывучэнню выкарыстання вылічальнай тэхнікі; для слухачоў універсітэта педагагічнага майстэрства (другога года навучання) будуць прачытаны лекцыі і праведзены практычныя заняткі па методыцы прымянення тэхнічных сродкаў навучання. Для вучэбна-дапаможнага саставу ствараюцца курсы па падрыхтоўцы кінадэманстратараў і вывучэнню кінасправы. Акрамя таго, адшукваюцца магчымасці для радыёфікацыі паточных аўдыторый і комплекснага аснашчэння іх тэхнічнымі сродкамі (сродкамі аўтаматычнага зашторвання вокан, шафамі дыяпраекцыйнай апаратуры і пультамі дыстанцыйнага кіравання ёю).

У гэтым годзе даволі паспяхова рашаецца старая праблема дошкі і мелу. Па ініцыятыве вучэбнага аддзела ў вучэбна-вытворчых майстэрнях выраблена некалькі эксперыментальных шкляных дошак. Яны аднадушна адобраны выкладчыкамі і студэнтамі. І ў 1973 годзе па рашэнню рэктарата такімі дошкамі будуць абсталяваны асноўныя аўдыторыі, кабінеты і лабараторыі. Да пачатку навучальнага года шкляныя мелавыя дошкі ўстаноўлены ва ўсіх паточных аўдыторыях фізічнага, гістарычнага, хімічнага, біялагічнага, філалагічнага і матэматычнага факультэтаў. Гэта работа працягваецца.

Вялікую ўвагу ўдзяляе рэктарат укараненню тэхнічных сродкаў у кіраванне вучэбным працэсам. Уведзена ў эксплуатацыю сістэма аўтаматычнай сувязі рэктарата з асноўнымі падраздзяленнямі універсітэта; да пачатку навучальнага года ўступіла ў дзеянне АТС на 400 абанентаў.

Зроблена як быццам многа, але ў той жа час і мала. Да канца пяцігодкі прадстаіць усе паточныя аўдыторыі аснасціць комплексам тэхнічных сродкаў; лік лінгафонных кабінетаў давесці да 10—12, кабінетаў (класаў) навучаючых і кантралюючых машын — да 10. У гэтым годзе неабходна стварыць фільматэку, лабараторыю навучаючых (кантралюючых) і тэхнічных сродкаў навучання, дэталёва вывучыць пытанне аб стварэнні кафедры тэхнічных сродкаў і праграміраванага навучання.

Вялікую навукова-метадычную работу прадстаіць выканаць прафесарска-выкладчыцкаму саставу па распрацоўцы псіхолага-педагагічных і метадычных пытанняў выкарыстання тэхнічных сродкаў у вучэбнай, навукова-даследчай рабоце і кіраванні вучэбным працэсам. Наспела пытанне аб укараненні машыннага састаўлення раскладаў, выкарыстання ЭВМ ва ўліку матэрыяльных сродкаў і для аператыўнай інфармацыі аб наведванні, паспяховасці, кантынгенце студэнтаў і г. д.

Усе гэтыя задачы па плячу калектыву нашага універсітэта, і, трэба думаць, яны будуць паспяхова вырашаны.

М. НІКІЦЕНКА,
інжынер вучэбнага аддзела.

Верасень працоўны... Адных ён выпрабоўвае на калгасных палях, другіх — у школьных класах у час педагагічнай практыкі перад сотнямі дапытлівых вучняў. А гэтыя юнакі і дзяўчаты з геафака адчуваюць верасень па-студэнцку: у іх лекцыя па методыцы выкладання, якую чытае прафесар В. А. Жучкевіч.

Фота **Д. Чаховіча.**

ДОМ БЕЗ ГАСПАДАРА

Кажуць, што той не быў сапраўдным студэнтам, хто не жыў у інтэрнаце. Можа і маюць рацыю гэтыя аматары абагульненняў, і хутчэй сапраўды так: іменна інтэрнат расшырае кола зносін людзей, дазваляе быць у эпіцэнтры жыцця вну. Але той жа інтэрнат адбірае ў многіх шмат карыснай энергіі на ўладкаванне бытавых праблем, пачынаючы з пакояў і канчаючы... Хаця, стоп! Мы пачнём не з пакоя.

У інтэрнаце № 5 мы трапілі спачатку ў кабінет да каменданта І. Ф. Яшкіна. Сюды прывяла нас папера —дакладная дэканата падрыхтоўчага факультэта на імя прарэктара па гаспадарчай рабоце, у якой па пунктах пералічваліся тыя пытанні, якія неабходна вырашыць у інтэрнаце № 5 да пачатку навучальнага года.

З іх мы і пачалі размову. Амаль адразу яна прыняла аднабаковы характар. Мабыць, зыходзячы з меркавання, што лепшая абарона —нападзенне, — Іосіф Фаміч доўга і голасна расказваў, як шмат зроблена ў інтэрнаце, і што ўсё амаль у поўным парадку. Засталіся нейкія дробязі. Праўда, па інтэрнату правесці адмовіўся, спаслаўшыся на неадкладныя справы.

І мы пайшлі самі.

Знешне ўсё выглядала сапраўды няблага: чыстыя пустыя калідоры, зачыненыя дзверы пакояў, шыльдачкі на дзвярах кухні і ўмывальніка. Няблага, калі не лічыць, што некаторыя дзверы нельга адчыніць толькі таму, што на іх адсутнічаюць дзвярныя ручкі, што амаль усе кухні сустракалі нас пранізлівым холадам, які ішоў праз разбітыя шыбы, брудным старымі сталамі, іржавымі цітанамі, што, мабыць, ніколі і не былі ў рабоце. Ва ўмывальніках гэтак жа сумна пазіраюць разбітым шклом вокны. Пабіты яны і ў пакоях 552, 550, 545 і многіх іншых. Думаеце, аб гэтым не ведае камендант! Ведае. І нават урачыста аб'явіў нам, што сёння (15 верасня!) даў заданне столяру пачаць шкліць вокны. А, між тым, яшчэ пяць дзён назад у журнал гэтага ж столяра была запісана просьба зашкліць вокны ў пакоях 540, 541, 543 і 227.

Калі ў каменданцкай ішла размова пра гэтыя злашчасныя вокны, І. Ф. Яшкін катэгарычна адрэзаў: вокны б'юць самі студэнты, няхай самі і зашкляць. Валерый Сізоў, старшыня студсавета інтэрната, які прысутнічаў пры гэтым, прамаўчаў, разумеў, што камендант мае рацыю, але, мабыць. як і раней, не хацелася займацца гэтай валакітнай справай. Свае ж таварышы! А не прамаўчы тады Валерый, і Іосіфа Фаміча можна было б пераканаць, што не заўсёды вінаваты студэнты, і абмеркаваць, як вырашыць «праблему вокнаў» на будучае.

Вернемся да паперы, з якой пачыналася наша размова. Адрасавана яна была прарэктару па гаспадарчай рабоце. З адміністрацыйна-гаспадарчай часткі яе пераадрасавалі каменданту інтэрната № 5 і, відаць, супакоіліся, лічачы, што ў асноўным усё будзе зроблена, ну, а дробязі... Толькі гэтыя дробязі не такія ўжо няважныя. Мяркуйце самі: на другім паверсе левага крыла інтэрната месяц назад быў зроблен рамонт, а ўжо сёння абвальваецца са сцен тынкоўка разам са свежананесенай фарбай, ва ўмывальніках то тут, то там не хапае абліцовачных плітак на сценах, не адрамантаваны краны, няма змешвальняў для вады. Дарэчы, вакол гэтых змешвальняў разгарэліся цэлыя баталіі. Іосіф Фаміч рашуча супраць такой «раскошы». Маўляў, ёсць душ і пральня, і там колькі хочаш гарачай вады. Толькі не верыцца, каб марозным зімовым ранкам мыўся камендант у сваёй кватэры зусім ледзяной вадой. А студэнты «пераб'юцца»! Няхай маўчаць і дзякуюць, што жывуць не на прыватнай кватэры, а ў інтэрнаце! Адсюль і ідуць зняважлівыя адносіны да чалавека, які носіць імя — студэнт, імкненне аб'явіць капрызам кожную студэнцкую просьбу.

У той жа размове высветлілася, што як і ў некаторых іншых інтэрнатах, кухні пятага не абсталяваны плітамі. Студэнты купляюць свае электраплітки, гатуюць ежу часта ў пакоі, псуючы падлогу, сцены. А што можна зрабіць! І. Ф. Яшкін лічыць, што гаспадарчая частка ў сілах абсталяваць усе кухні вялікімі электраплітамі тыпу газавых, якія выпускае наша прамысловасць. Меркаванне слушнае. І калі выказваў яго камендант, у яго быў голас сапраўднага гаспадара. Першы раз.

Могуць сказаць, навошта было біць у званы! Нічога ж асаблівага не здарылася. Бывае і горш. Так, бывае. Інтэрнат № 3, напрыклад, сустрэў студэнтаў-журналістаў брудам, гарой паламанай мэблі, тымі ж разбітымі вокнамі, якія, дарэчы, і па сённяшні дзень не зашклёныя. На кухні склад матрацаў. На ўвесь інтэрнат і зараз — толькі адзін душ на два чалавекі. І мыюцца ў ім—хто раней трапіць.

Гэтага магло і не быць, калі б у кожным студэнцкім доме быў сапраўдны гаспадар. Руплівы, дбайны, няўрымслівы. Каб балела ў яго душа за справу і за людзей.

Л. ДРУЗЕВА.

Радыё „Беларускага УНІВЕРСІТЭТА"

...І ЎСЕ ЗА АДНАГО

ЛЕТАПІС ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

Больш чатырох тысяч студэнтаў нашага універсітэта дапамагаюць ва ўборцы ўраджаю ў калгасах і саўгасах Бярэзінскага, Чэрвеньскага, Валожынскага і Мінскага раёнаў. Работа арганізавана па прынцыпу студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Весткі з калгасных палёў гавораць аб поспехах у працы.

ЮНАЦКІЯ галасы разбудзілі маўклівую цішыню калгасных палёў. На бульбяныя палеткі выйшла бульбакапалка, а ўслед за ёй з кашамі ў руках накіраваліся 26 чалавек — студэнты чацвёртага курса факультэта журналістыкі. І закіпела праца.

Спачатку, праўда, хваляваліся. Яшчэ б! Трэба ж не падкачаць, бо рабочыя саўгаса «Ракаўскі» Валожынскага раёна ва ўсім паклаліся на іх сумленне.

За першы працоўны дзень назбіралі 11,2 тоны бульбы. Праз два дні — 13,6, потым — 16,8 тоны. А вось учора рашылі пайсці на штурм уласных рэкордаў. За палову працоўнага дня да буртоў адвезена 10600 кілаграмаў клубняў.

Брыгадзір брыгады «Бузуны» Павел Пятровіч Грамовіч спачатку не паверыў: здаецца, і бульба на гэтым участку не лепей, і людзей не прыбавілася, нават трое захварэлі. Гэта ж амаль дзённую норму выканалі! Ці няма памылкі? Падлічылі яшчэ раз. Няма.

— Малайцы, рабяты! — сказаў тады брыгадзір. — Вось гэта і ёсць студэнцкі запал у працы. Так трымаць!

Поспех акрыліў байцоў студэнцкага сельскагаспадарчага атрада і надаў новыя сілы. Працавалі яшчэ больш старанна. Праўда, зараз даводзіцца цяжэй. Перашкаджаюць холад, вецер, дажджы. Таму — ні хвіліны прастою, бо хто ведае, што можа здарыцца ў наступны момант: выблісне сонца ці зімжыць дробны асенні дождж.

Студэнты робяць усё магчымае, каб не дапусціць марнай траты дарагога часу. Прыклад паказваюць камандзір атрада камуніст Уладзімір Купрыенка, камісар Уладзімір Субат, Вячаслаў Рубанаў, Сяргей Пяткоўскі, Ала Жаваранак, Людміла Цімчанка, Таццяна Смірнова і іншыя. У атрадзе ніхто не размяжоўвае: гэта тваё, а гэта маё. Тут усё наша. Трэба дапамагчы адстаючым — дапамогуць. Штосьці не ладзіцца на кухні ў павароў Тамары Лукашэвіч і Наташы Сакаловай — праводзіцца лятучка-сход. І справа вырашаецца тут жа.

А вечарам многія хлопцы і дзяўчаты збіраюцца разам і пад гітару Уладзіміра Сверкунова спяваюць песні. Хто ведае, можа яны прадвеснікі будучага канцэрта для хлебаробаў саўгаса?

Рэдактар курсавой газеты «Летапісец» Слава Рубанаў нешта ўсё адзначае ў сваім блакноце, падбухторвае хлопцаў і дзяўчат: «Давайце матэрыялы!» Значыць, рыхтуецца чарговы нумар «Баявога лістка».

Рабяты з СБА працуюць і жывуць па прынцыпу: адзін за ўсіх і ўсе за аднаго.

У. СКУЛЬБЕДАЎ,
студэнт.

● **Трэці семестр працягваецца тут, на вучэбна-геаграфічнай базе «Заходняя Беразіна». Будаўніцтва жылога дома вядзе атрад III курса геафака.**

● **«Пяцімінутка» на бульбяным полі — гэта і кароткі адпачынак, і час для абмеркавання неадкладных спраў атрада першага курса.**

● **Наступае момант, калі адыходзіць некуды стомленасць. Тады работа прыносіць задавальненне.**

Фота Д. ПРЭСА.



ВЫХАВАННЕ ПЕДАГОГА

Большасць выпускнікоў універсітэта накіроўваецца на працу ў школы рэспублікі. Пры ўсёй паўнаце іх навуковага багажу неабходна, каб пачынаючы настаўнік быў псіхалагічна і ў пэўнай меры практычна падрыхтаван да школы. Вось чаму вялікае месца ў вучэбным працэсе універсітэта займае педагагічная практыка. У 1972-1973 навучальным годзе педагагічную практыку праходзіла 2100 студэнтаў дзённай, вячэрняй і завочнай форм навучання ў 80 сярэдніх агульнаадукацыйных школах г. Мінска, у сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Студэнты завочнай формы навучання — па месцу жыхарства.

Практыкай кіравалі пяць факультэцкіх, 225 групавых метадыстаў, з іх 136 — выкладчыкі універсітэта, 89 — настаўнікі і кіраўнікі школ. Напярэдадні практыкі дэканаты разам з кафедрай педагогікі і псіхалогіі, спецкафедрамі, кафедрамі грамадскіх навук, факультэцкімі і групавымі метадыстамі правялі са студэнтамі інструктыўныя нарады, на якіх вызначылі мэту і задачы, аб'ём і змест практыкі.

Вялікую ўвагу практыцы ўдзяляюць рэктарат, партком, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў, навуковы аддзел, асобныя спецкафедры, кафедры грамадскіх навук, дэканаты, бібліятэка. Лепш арганізаваць грамадска-палітычную практыку дапамагаюць кафедры грамадскіх навук. Другі год наша аддзяленне таварыства «Веды» аказвае сваю дапамогу студэнтам у правядзенні лекцый, гутарак.

Вынікі педпрактыкі гэтага года паказалі, што ўзровень ведаў па спецыяльнасці ў студэнтаў вельмі высокі. Гэта дае ім магчымасць навукова і, разам з тым, даступна выкладаць матэрыял. Выкарыстанне навукова-папулярнай літаратуры рабіла ўрокі цікавымі і займальнымі. Веды асноўных метадычных палажэнняў давалі магчымасць творча будаваць урок, прыцягваць навучэнцаў да назіранняў і эксперыментаў, актывізаваць іх разумовую дзейнасць.

Шматгадовы вопыт паказвае, што педпрактыка праходзіць больш мэтанакіравана на тых факультэтах, дзе студэнты займаюцца навукова-даследчай работай па спецыяльнасці. Напрыклад, на філфаку ўжо стала традыцыяй правядзенне даследчай работы ў час практыкі, і як вынік — арганізацыя навукова-метадычных канферэнцый. У гэтым навучальным годзе навукова-метадычная канферэнцыя была прысвечана 50-годдзю ўтварэння СССР.

Такая ж канферэнцыя адбылася ў гэтым годзе і на геаграфічным факультэце. Было заслухана 16 студэнцкіх дакладаў.

Як вынік — 8 прац студэнтаў філфэка прадстаўлены на студэнцкую навуковую канферэнцыю, прысвечаную ленінскім дням, і 5 работ студэнтаў геаграфічнага факультэта прадстаўлены на студэнцкі агляд.

На высокім узроўні прайшла практыка на біялагічным, хімічным і гістарычным факультэтах. Добра зарэкамендавалі сябе 39 студэнтаў філалагічнага і фізічнага факультэтаў, якія самастойна працавалі ў сельскіх школах Магілёўскай і Мінскай абласцей.

Пазакласная і пазашкольная работа праводзілася па планах, складзеных класнымі кіраўнікамі, старшай важатай, камітэтам камсамола школы. Але многія студэнты праявілі сваю ініцыятыву, прапаноўвалі і праводзілі цікавыя мерапрыемствы. Яны прачыталі больш 1000 лекцый, прысвечаных 50-годдзю ўтварэння СССР, па пуцеўках таварыства «Веды». З дапамогай студэнтаў былі арганізаваны цікавыя дыспуты і гутаркі ў камсамольскіх класах: «Ці ёсць месца подзвігу ў наш час?», «Вялікі подзвіг народа», «Наш Саюз вечны», «Біяграфія пяцігодак», «Думы аб хлебе» і іншыя.

Падрыхтоўка і правядзенне фестываляў, прысвечаных 50-годдзю ўтварэння СССР, афармленне стэндаў аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Я. Коласа, Я. Купалы, карты новабудоўляў БССР — усё гэта рабілася з дапамогай студэнтаў. Яны былі ўдзельнікамі жыцця школьных камсамольскіх арганізацый. Цікавую работу праводзілі студэнты V курса хімічнага факультэта (метадыст Г. А. Лазерка), высвятляючы, колькі часу затрачвае вучань на падрыхтоўку хатняга задання. Даныя даследаванняў былі выкарыстаны ў практычнай дзейнасці школы.

Рознабакова будавалася работа практыкантаў у піянерскіх класах. Яны былі арганізатарамі і ўдзельнікамі сходаў, прысвечаных 50-годдзю ўтварэння СССР, на маральна-этычныя, патрыятычныя, інтэрнацыянальныя тэмы: «Вялікі подзвіг народа», «Піянеры-героі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне», «Усе працы добрыя, выбірай па густу», «Этыка ўзаемаадносін», «Як вучыўся У. І. Ленін».

Студэнты біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў праводзілі гутаркі аб ахове прыроды: «Аб рэдкіх і выміраючых жывёлах», «Жывёльны свет БССР», «Запаведнікі БССР», «Карысныя выкапні БССР» і іншыя.

Многія выкладчыкі БДУ прымалі актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзіліся студэнтамі ў школах. Частымі гасцямі вучняў былі пісьменнікі і паэты — прафесар А. А. Лойка, дацэнты Н. С. Гілевіч, І. А. Зэзека, П. І. Ткачоў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, дацэнты А. І. Кажушкоў, Л. Л. Кароткая, В. А. Захарава, Д. А. Багрова, С. А. Лысенка. Нямала цікавых лекцый прачытана студэнтамі для бацькоў: «Роля сям'і ў выхаванні дзяцей», «Праца — асноўны фактар выхавання». Яны ж наведвалі вучняў дома, бывалі на прадпрыемствах, дзе працуюць вучні вячэрніх школ. Не абыходзіліся без удзелу студэнтаў вечары фізікі, біялогіі, хіміі, літаратурна-мастацкія вечары.

Будучыя настаўнікі працавалі ў гуртках, рыхтавалі наглядныя дапаможнікі, дапамагалі ў абсталяванні кабінетаў. Цікавую і змястоўную работу праводзілі студэнты завочнай формы навучання.

Паспяховаму правядзенню практыкі садзейнічалі факультэцкія кіраўнікі старшыя выкладчыкі Е. А. Скачко, А. В. Ганжына, дацэнты Т. П. Адамовіч, Г. А. Лазерка, Л. А. Паўловіч, Н. К. Чартко, М. А. Майракаў, Д. В. Сіненка, Е. Ф. Саўчук, В. А. Караўшкіна, А. А. Стуканаў, Н. А. Аўласенка, Л. А. Царанкоў, А. М. Багаслоўскі, прафесары Л. І. Фіглоўская, В. А. Жучкевіч, В. Р. Заўрыеў, В. А. Дзяменцьеў.

З году ў год дапамагаюць студэнтам у авалоданні навыкамі педагагічнага майстэрства заслужаныя настаўнікі, дырэктары школ Е. С. Міронаў, С. Д. Самушчаў, Р. І. Хамчонак, Т. В. Славінская і многія іншыя.

Каб узняць педагагічную практыку на новую ступень, прадстаіць вялікая работа ў сёлетнім навучальным годзе.

К. МАЗУРКЕВІЧ.

КНІГІ БУДУЧАГА ГОДА

Выйшаў з друку і накіраван у кнігагандлёвую сетку для збору тыражоў тэматычны план выпуску літаратуры выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна на 1974 год. У тэматычны план уключана 59 назваў кніг. Усе рукапісы, за выключэннем аднаго (міжвузаўскі зборнік «Пытанні гісторыі КПСС»), ужо паступілі ў выдавецтва. Па стану на 17 верасня 13 з паступіўшых рукапісаў набіраюцца або набраны; 33 рукапісы знаходзяцца на розных стадыях падрыхтоўкі да вытворчасці (рэдактыруюцца, вычытваюцца карэктарамі, дапрацоўваюцца аўтарамі пасля рэцэнзавання і г. д.).

Намечана выпусціць 12 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Сярод іх «Курс лекцый па гісторыі КПСС», ч. II (выданне 2-е, перапрацаванае і дапоўненае. Пад рэдакцыяй У. М. Сікорскага), «Логіка» (пад рэдакцыяй Р. А. Левіна), «Палітычная эканомія сацыялізму» (пад рэдакцыяй А. П. Скумана), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай публіцыстыкі» (Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка), «Лекцыі па матэматычнаму аналізу (Ю. С. Багданаў), «Фотабіялогія» (С. В. Конеў, І. Д. Валатоўскі) і іншыя.

Найбольш вялікі ў тэмплане 1974 года раздзел грамадска-палітычнай літаратуры. Тут хацелася б адзначыць такія работы, як «Аб камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі» (зборнік артыкулаў), «Пераходныя формы вытворчых адносін» (С. Е. Янчанка), «Барацьба беларускага народа за аб'яднанне з Расіяй» (А. П. Ігнаценка), «У. І. Ленін аб задачах рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыята Польшчы» (І. Л. Пятровіч), «Савецкая выбарчая сістэма» (А. Т. Лейзераў) і інш.

Выдавецтва выпусціць некалькі цікавых работ па раздзелах «Філалогія, журналістыка, педагогіка». Гэта «Песні народных свят і абрадаў» Н. С. Гілевіча, «Друк Заходняй Беларусі» (1921—1939 гг.)» С. В. Говіна, «Многааблічны экран» М. Е. Дастанкі, А. А. Плаўнік, «Аналітычныя жанры» Б. В. Стральцова.

Асноўнае месца ў раздзеле «Літаратура па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках» займаюць работы, прысвечаныя вылічальнай тэхніцы і аўтаматызаваным сістэмам кіравання.

Тэмплан 1974 года мае і свае недахопы. У ім мала актуальных прац па гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, канкрэтнай эканоміцы, сучаснаму літаратуразнаўству, літаратурна-мастацкай крытыцы.

У выдавецкіх планах вельмі сціплае месца працягваюць займаць работы па прыродазнаўчых навуках.

Выдавецтва БДУ сумесна з рэктаратам пастаянна працуе над удасканаленнем тэматычных планаў выпуску літаратуры. Пытанні састаўлення і выканання планаў рэдакцыйнай падрыхтоўкі і планаў выпуску літаратуры абмяркоўваюцца на рэктарате і пасяджэннях рэдакцыйна-выдавецкага савета БДУ. Выдавецтва час ад часу звяртаецца з адпаведнымі пісьмамі да загадчыкаў кафедр БДУ. На жаль, не ўсе кафедры адгукаюцца на нашы пажаданні. Так, на просьбу выдавецтва падаць да 15 чэрвеня 1973 года план манаграфічных публікацый і зборнікаў артыкулаў на 1976—1980 гг. адгукнулася ўсяго толькі 15 кафедр.

Карыстаючыся магчымасцю, мы зноў звяртаемся да загадчыкаў кафедр з просьбай абмеркаваць на адным з бліжэйшых пасяджэнняў перспектыўны план друкаваных прац на 1976—1980 гг. і падаць яго ў выдавецтва.

В. ГРЫГОР'ЕЎ,
галоўны рэдактар выдавецтва БДУ.

ГЭТЫ ЗАХАПЛЯЮЧЫ СВЕТ

Для многіх юнакоў і дзяўчат гады студэнцтва становяцца часам трывалага захаплення мастацтвам. Яны спрабуюць свае сілы як вакалісты і танцоры, дэкламатары, акцёры самадзейнага тэатра, з захапленнем займаюцца ў славутых універсітэцкіх калектывах і ў сваіх факультэцкіх.

Штогод, як пачынаюцца заняткі, гасцінна запрашаюць да сябе навічкоў **народны ансамбль «Крыжачок», народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, студэнцкі тэатр, духавы і эстрадны аркестры, цымбальная група і вакальная студыя.**

Адзін з лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці — народны ансамбль танца «Крыжачок»—пастаянна ўдзельнічае ва ўсіх дэкадах, фестывалях і аглядах мастацкай самадзейнасці рэспублікі. Ён шмат разоў быў узнагароджан дыпломамі I, II, III ступені і ганаровымі грамотамі. «Крыжачок» прадстаўляў беларускае танцавальнае мастацтва ў розных рэспубліках нашай шматнацыянальнай Радзімы. на ўдарных камсамольскіх будоўлях, на цалінных землях Казахстана, у Маскве, Ленінградзе, Рызе, Казані, Харкаве, у Калінінградзе, Севастопалі, Вільнюсе і іншых гарадах. У 1969 годзе «Крыжачок» выязджаў з вялікай канцэртнай праграмай у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, у 1971 годзе наведаў Народную Рэспубліку Балгарыю.

Вялікую канцэртную дзейнасць вялі і іншыя калектывы мастацкай самадзейнасці. Напрыклад, народны аркестр народных інструментаў выступаў у Калінінградзе, Брэсце, у гарадах і сёлах Мінскай вобласці. На ўсіх чатырох дэкадах самадзейнага мастацтва Беларусі гэты калектыў займаў першыя месцы. Ён — уладальнік прыза імя Дзяржаўнага народнага аркестра БССР. У 1972 годзе аркестр заняў I месца ў абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР.

Народная харавая капэла, якая прымала ўдзел у абласным аглядзе харавых калектываў, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР, заняла другое месца.

Шмат спектакляў і канцэртаў у гарадах і вёсках Беларусі далі студэнцкі тэатр, эстрадны і духавы аркестры.

Зараз у самадзейных артыстаў ідуць напружаныя рэпетыцыі. Да новых сустрэч з гледачамі рыхтуюцца ўсе калектывы. І ўсе яны чакаюць новае папаўненне, чакаюць вас, сябры, тых, хто любіць мастацтва і гатоў прысвяціць яму свой вольны час.

А. ФЯДОТАЎ.

НАШ КАЛЯНДАР

А. П. ФЕДЧАНКА (1844—1873)

Прайшло стагоддзе з таго моманту, калі пры спуску з аднаго з ледавікоў гары Манблан у Альпах загінуў малады таленавіты натураліст і выдатны падарожнік-географ Аляксей Паўлавіч Федчанка. З яго імем звязана вывучэнне прыроды цяжкадаступнай, амаль невядомай раней высакагорнай вобласці паміж вялікімі нагор'ямі Цянь-Шаня і Памір.

Пасля заканчэння ў 1864 годзе Маскоўскага універсітэта Федчанка займаўся батанікай, заалогіяй і антрапалогіяй. Першае ж падарожжа ў горы Туркестана ў 1868 годзе па даручэнню Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства выклікала ў ім вялікую зацікаўленасць да геаграфічных і этнаграфічных даследаванняў. На працягу чатырох год малады вучоны даследаваў пустыні і горы, якія прылягаюць да ракі Сыр-Дарья, да раёнаў Ташкента, Самарканда, Ферганы, падымаўся да снегалядавіковых вяршынь Зераўшанскага, Туркестанскага і Гісарскага хрыбтоў, пранік да берагоў возера Іскандэр-куль. У 1871 годзе ён упершыню перасёк магутны ланцуг Алайскага хрыбта і выйшаў да ізумрудных лугоў горных пашаў Алайскай даліны. Тут перад ім адкрылася грандыёзная панарама заснежанага Заалайскага горнага ланцуга. Федчанку належыць адкрыццё самай высокай вяршыні хрыбта, якая цяпер носіць імя вялікага Леніна. Даследаваннямі Федчанкі было ўстаноўлена шырыннае распаўсюджанне хрыбтоў Цянь-Шаня ў процілегласць панаваўшаму раней памылковаму ўяўленню аб існаванні мерыдыянальнага хрыбта Балор. Былі сабраны каштоўныя прыродазнаўча-гістарычныя і этнаграфічныя калекцыі, адкрыты сотні відаў раслін і жывёлін, невядомых раней у навуцы. На падставе прымянення параўнальнага геаграфічнага метаду вучоны ўстанавіў сувязі мясцовай флоры і фауны з раслінным і жывёльным светам Сярэдняй, Цэнтральнай і Пярэдняй Азіі.

Работы Федчанкі высока ацэньваліся яго сучаснікамі — географамі і біёлагамі. Яго імем В. Ф. Ашанін, таксама вядомы даследчык Туркестана, назваў буйнейшы ледавік Паміра.

Кароткі, але яркі жыццёвы шлях А. П. Федчанкі — прыклад самаадданага служэння навуцы, поўнага энтузіязму да любімай справы.

В. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ,
прафесар, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі СССР.

Не будзем сцвярджаць, што Канстанцін Куксо, студэнт III курса філфака, з дзяцінства захапляецца маляваннем — дакладна не ведаем. А што ў апошнія два гады ён аддае перавагу карыкатуры, сяброўскаму шаржу, несумненна. Аб гэтым лепш за ўсё гавораць яго малюнкі, што друкаваліся ў газеце «Знамя юности», у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».

Сёння мы прадстаўляем маладога мастака работамі з серыі «Людзі і звяры».

Людзі і звяры

ДАРАГІЯ НАШЫ ЧЫТАЧЫ!

Мы разам з вамі ўвайшлі ў новы год студэнцкага жыцця. Ён будзе па-свойму незвычайным, багатым цікавымі падзеямі, прынясе кожнаму шмат ведаў, хваляванняў і, спадзяемся, перамог у вучобе і спорце, поспехаў у грамадскай дзейнасці.

Рэдкалегія шматтыражкі прыкладзе ўсе сілы, каб паўней асвятляць студэнцкае жыццё. Але нам патрэбна ваша дапамога. Таму шчыра запрашаем вас да ўдзелу ў выпуску кожнага нумара. Пішыце нам аб тым, што хвалюе вашу студэнцкую групу, прыносьце замалёўкі аб сябрах і цікавыя фотаздымкі, малюнкі, вершы, гумарэскі. Аператыўна паведамляйце аб непаладках у інтэрнатах, у сталовых і буфетах, выказвайце свае прапановы па паляпшэнню студэнцкага быту, работы вучэбных кабінетаў, бібліятэкі.

Будзьце актывістамі сваёй студэнцкай газеты, паклапаціцеся, каб яна дастаўлялася ў кожную групу!

Чакаем вашых матэрыялаў!

Рэдакцыя знаходзіцца ў геаграфічным корпусе, пакой 14, тэлефон 22-07-19.

РЭДКАЛЕГІЯ.

АПАВЯДАННЕ

АНДРЭІХА

АЎТОБУС ускаціўся на ўзгорак. Пасажыры, стомленыя доўгай дарогай, драмалі. І трэба ж было!? Я рассмяялася... Усе здзіўлена і з нейкай лагоднай злосцю пазіралі на мяне, маўляў, з чаго б гэта?

Як жа было мне растлумачыць, што вінаваты ўспаміны такога далёкага і такога блізкага дзяцінства.

А аўтобус імчаў па гасцінцу, і ўжо каторы раз я бачыла знаёмыя рысы вёскі, у якую яшчэ немаўляткаю прыязджала да бабулі. Вось і прыпомнілася мне цяпер, як у сваіх «шаноўных» гадах думала, што ўсе пуцявінкі-дарожкі канчаюцца за гэтай бабулінай вёскай.

Наіўны дзіцячы свет... Хораша было тады. Нават калі падрасла і пайшла ў школу, любіла ціхенька бегчы гумнамі з гасцінца і, не заўважыўшы бабулі ў дварышчы, убегчы ў сенцы і загадкава пастукацца. Чуліся павольныя бабуліны крокі з другога пакоя і знаёмы голас: «Калі ласка». Я адчыняла дзверы і кідалася да яе, разгубленай і шчаслівай.

Калі ж ішла праз вёску, па бруку, які здаваўся мне поўным таямніц старажытнасці, то першай мяне сустракала бабуліна суседка Андрэіха. Так было кожны раз. Мне здавалася, што яна ўвесь час сядзіць ля акна і пільнуе, калі я з'яўлюся на вуліцы.

Не разумела тады я старую. А яна была надзвычай гасціннай. Да майго прыходу ўсё было падрыхтавана. Вялізны хлебны каравай, варэнне з усіх, што ні ёсць, ягад у гушчары, яблыкі, слівы, ігрушы. Я сама не ведала, чаму не магла прайсці міма яе хаты, сказаць проста «Дзякуй за гасціннасць» і пабегчы да сваёй бабулі.

Я палюбіла Андрэіху. Мая бабуля даведвалася аб маім прыездзе толькі тады, калі я цягнула Андрэіху да калодзежа. Хоць у хаце яе было яшчэ з раніцы пананошвана вады, я прымушала яе браць любую пасудзіну і патураць мне. Вельмі ж ужо да спадобы быў мне яе калодзежны журавель. Але і тады я не магла зразумець аднаго — чаму такая шчодрая, ласкавая бабуля ніколі не ўсміхнецца пасапраўднаму, а калі ўсміхнецца, то ў вачах блішчаць слёзы. Бабуля, якая ведае такія цікавыя казкі і так хораша спявае. Але гэтыя сумненні палохалі мяне прадчуваннем нечага страшнага, і я забывалася на ўсё да наступнай сустрэчы.

Аднаго разу не прывітала мяне знаёмая хаціна. Я стаяла хвіліну, другую. Ніхто не выходзіў. Цікаўнасць узяла верх. Я зазірнула ў акно. Знаёмы белы абрус, невялічкі букецік з рамонкаў і васількоў, ложак. На ім ляжала мая Андрэіха. Я хуценька падбегла да яе, пачала плакаць. А яна неяк дзіўна глядзела на мяне, заплюшчвала вочы, зноў глядзела.

«А, гэта ты, а я думала...» Яна не змагла дагаварыць, рукі бездапаможна апусціліся. Па ўпалых, маршчыністых шчоках цяклі слёзы. Я выцірала іх ручніком, а яны цяклі і цяклі, горкія, як палын, Андрэішыны слёзы.

Колькі часу сплыло ў нябыт, а я не забуду гэтую сустрэчу з Андрэіхай.

Пасля ўсё стала на сваё месца. Зноў сустракала мяне Андрэіха, зноў мне было хораша з ёю. Толькі калі мы збіраліся разам—я, Андрэіха і мая бабуля Кацярына,—Андрэіха рабілася сумнай. Я бачыла нейкую зайздрасць у яе вачах. Аднойчы, калі мы вярталіся ўвечары дадому, я нарэшце спытала ў бабулі:

— Чаму ўсе клічуць Андрэіхай гэту старую? І чаму яна заўсёды такая сумная?

Доўга сядзелі мы ля печкі. Бабулі цяжка было расказваць. Яна гаварыла, спынялася, бы набіралася сіл, каб сказаць яшчэ нешта вельмі жахлівае.

...Жылі мы, як і цяпер, па суседству. Толькі Андрэіха хіба такой была... Маладая, руплівая на работу. Добра жылі мы, як і ўсе. Андрэй ейны лесніком быў, дык мы, бывала, збяромся ў нядзелю і пайшлі ў лес на цэлы дзень. Андрэй жа ўсе ягадныя і грыбныя месцы ведаў.

Паважалі Андрэя і Андрэіху аднавяскоўцы. І сын у іх падрастаў, прыгожы такі хлопец. Петрусём звалі. Ды, каб на яго ліха, вайна. Немцаў неўзабаве наляцела, як варання. Радзей сталі мы сустракацца з Андрэіхай. А як сустрэнемся, дык Андрэіха ў бяду: «Што гэта з маім старым? Як зойдзе ў лес, дык толькі прыцемкамі вяртаецца». Не ведала яна, што Андрэй ейны сувязным у партызан. А стары ведаў сваю справу. Ды, як кажуць, у сям'і не без выradка. Знайшоўся ў вёсцы адзін падлюга, выдаў немцам Андрэя. І калі той, як звычайна, вяртаўся з лесу, яго чакала засада. Немцы далі старому час падумаць і выбраць —жыць ці памерці.

Жыць—гэта значыць завесці сабачую зграю да партызан. Ён выбраў апошняе, крыкнуў гадам: «Я жыў чэсна на гэтай зямлі і не страшна за яе памерці».

Вось якое гора навалілася на Андрэіху. А неўзабаве сышоў з дому Пятрусь. Знайшла Андрэіха паперу, у якой ён прасіў прабачэння за тое, што пакінуў яе адну: «Так трэба, матуля. Буду помсціць за тату».

Нядоўга знаходзіліся фашысты на нашай зямлі. Пачалі вяртацца дадому франтавікі. Мы з Андрэіхай пыталі пра Петруся. Ніхто нічога не ведаў. Праз некаторы час на знясіленыя вайной, горам плечы Андрэіхі ўпала сынава пахаронка. Пісаў незнаёмы баец, сябар Петруся:

«...Дарагая мама! Ваш сын змагаўся з ворагам за самае дарагое—Радзіму. Ён загінуў па-геройску, як належыць чырвонаму байцу».

Дык вось якая ты, Андрэіха, маці. Мне стала цяпер зразумела, што яна ўсё не верыць у сынаву смерць, яна чакае яго, як і многія маці.

І мяне сустракала яна, як і сына свайго сустракала б... Глядзела і глядзела на гасцінец, імкнучыся ўбачыць знаёмую постаць. А ў той дзень, калі не выйшла мяне сустракаць, атрымала пісьмо ад школьнікаў з Падмаскоўя. Яны пісалі, што даглядаюць за Петрусёвай магілай, саджаюць кветкі. А 9 мая праводзяць збор дружыны.

Нядаўна ў сталіцы на плошчы Перамогі я сустрэла незнаёмую бабулю і прыняла яе за Андрэіху. Вельмі ўжо многа іх, такіх Андрэіх, па ўсёй нашай Беларусі. Нізенькая, згорбленая бабулька стаяла ля Вечнага агню.

Т. КУПРЭВІЧ,
студэнтка філфака.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 Аб'ём—1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. АТ 07410 Зак. 1065. Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.